1. *Ариарский, М. А.* Прикладная культурология / М. А. Ариарский. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб., 2021. – С. 215–216.
2. Культура Беларусі: 20 год развіцця (1991–2011) : манаграфія / С. П. Вінакурава [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 181.
3. *Макарава, А. А.* Арт-праектаванне ў дзейнасці ўстаноў культуры / А. А. Макарава. – Мінск, 2023. – С. 82–84.
4. Учреждение культуры смешанного типа «Республиканский центр национальных культур» [Электронный ресурс] : официальный сайт. – Режим доступа: nationalcultures.by. – Дата доступа: 09.09.2024.

УДК 351.852:069-053.5

**Г. А. Машнюк,**
*аспірант установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

# ПРАБЛЕМА ЎКЛЮЧЭННЯ ПАНЯЦЦЯ «ДЗІЦЯЧЫ МУЗЕЙ» У ПРАВАВОЕ ПОЛЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Анатацыя.** У артыкуле падымаецца пытанне аб адсутнасці паняцця «дзіцячы музей» у заканадаўчых актах Рэспублікі Беларусь і абгрунтоўваецца неабходнасць яго ўключэння ў актуальнае заканадаўства. Падкрэсліваецца, што дзіцячыя музеі даўно існуюць у шэрагу краін, атрымалі тэарэтычнае абгрунтаванне і маюць вопыт працы. Адпаведна разглядаецца працэс развіцця спецыялізаваных музейных устаноў, накіраваных на працу з дзіцячай аўдыторыяй у Рэспубліцы Беларусь. Паказаны асноўныя дзіцячыя музеі, якія працуюць і сёння. Адлюстраваны асаблівасці экспазіцый беларускіх дзіцячых музеяў і іх канцэптуальная накіраванасць. Адзначаецца запатрабаванасць пашырэння дзіцячых музеяў і перспектывы іх працы.

**Ключавыя словы:** музей, дзіцячы музей, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, культурна-адукацыйная дзейнасць, музейная аўдыторыя, музеязнаўства.

**G. Mashnyuk,**
*Postgraduate student of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

# THE PROBLEM OF INCLUDING THE CONCEPT OF "CHILDREN'S MUSEUM" IN THE LEGAL FIELD OF THE REPUBLIC OF BELARUS

**Abstract.** The article raises the issue of the absence of the concept of "children's museum" in the legislative acts of the Republic of Belarus and substantiates the necessity of its inclusion in the current legislation. It is emphasized that children's museums have long existed in a number of countries, have received theoretical justification and have a great experience of work. Accordingly, the author examines the development of specialized museum institutions aimed at working with children's audiences in the Republic of Belarus, shows the main children's museums that are still operating today. The article identifies the features of the expositions of

Belarusian children's museums and their conceptual focus and notes the need to expand children's museums and the prospects for their work.
**Keywords:** museum, children's museum, the Code of the Republic of Belarus on Culture, cultural and educational activity, museum audience, museology.

Першы дзіцячы музей як спецыялізаваная музейная ўстанова з’явіўся ў канцы XIX ст. у Швецыі – музей Скансэн каля Стакгольма (1891) і ў Злучаных Штатах Амерыкі – Бруклінскі дзіцячы музей (1899) [2, с. 329]. Паяўленне дзіцячых музеяў было невыпадковым. У гэты час распрацоўваўся такі міждысцыплінарны напрамак, як музейная педагогіка (А. Ліхтваркам, Р. Гільдэбрандтам, Б. Отта, Г. Літца і інш.) у Германіі, што паспрыяла станаўленню музеяў, накіраваных на працу з дзіцячай аўдыторыяй [8, с. 45].

Пры гэтым фінансаванне музеяў у большасці краін свету ўскладаецца на дзяржаву. Пры дапамозе дзяржавы музеі ў перспектыве самі будуць акупляцца. Як адзначае Н. Г. Макарава на прыкладзе дзіцячых музеяў у ЗША ў пачатку 1980-х гг. Дзіцячы музей у Дэнверы 95 % прыбытку забяспечыў самастойна. Бостанскі дзіцячы музей пакрываў поўнасцю ўсе выдаткі: 70 % бюджэту складаў прыбытак ад дзейнасці музея, а 30 % – грошы ад фондаў і дабрачынных арганізацый. Дадзеная тэндэнцыя тлумачыцца вялікім ахопам музейнай аўдыторыі за кошт разнастайнай культурна-адукацыйнай дзейнасці, якая ўключае ўсе ўзроставыя групы аўдыторыі [6, с. 37–38].

У Рэспубліцы Беларусь першы Дзіцячы музей пачаў працу ў 2004 г. у складзе Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Асноўнай ідэяй дзіцячага музея з’яўляецца спасціжэнне дзецьмі навакольнага асяроддзя праз рэчавы свет. Асновай для будучай экспазіцыі стала праграма музейна-педагагічных заняткаў «Гісторыя звыклых рэчаў». У экспазіцыі, якая першапачаткова займала 2 залы, былі прадстаўлены гадзіннікі, вагі, падужныя званочкі, гукаўзнаўляльныя прылады, фотаапараты і калекцыі нумізматыкі і філатэліі. Асноўную аўдыторыю склалі дзеці ва ўзросце ад 4 да 15 гадоў [1, с. 54–55].

У складзе гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе» ў 2005 г. адкрыўся «Дзіцячы музей міфалогіі і лесу». Музей знаёміць наведвальнікаў з міфалогіяй беларусаў, ён падзелены на 2 зоны «Таямнічы лес» і «Хатка лесавіка» [3].

У сусветным развіцці дзіцячых музеяў ёсць асобны іх падвід – «Эксперыментарыум» – музей навукі, дзе дзеці ў форме «навуковых эксперыментаў» знаёмяцца з экспазіцыяй. Дадзены від музеяў набыў шырокую папулярнасць у краінах Заходняй Еўропы. У Рэспубліцы Беларусь падобны музей з’явіўся ў 2016 г. у Мінску пад назвай «Квантум». На плошчы ў 1000 квадратных метраў прадстаўлены наступныя комплексы: «Аэрадынаміка», «Энергія і магнетызм», «Механіка», «Оптыка», «Акустыка» і інш. У тэматычных зонах на-

ведвальнікі ў інтэрактыўнай форме знаёмяцца з пабудовай чалавечага цела, у комплексе «Акустыка» даведваюцца, як працуюць музычныя інструменты з магчымасцю сыграць на іх, комплекс «Оптыка» знаёміць з законамі праламлення святла і працай чалавечага вока [11].

Адзначым, што пачалі з'яўляцца і пара-музеі, напрыклад у Мінску пачаў працу ў канцы 2019 г. музей «Las-Legas». Калекцыя прадстаўлена разнастайнымі наборамі з дзіцячага канструктара Lego розных тэматычных напрамкаў. Таксама ў музеі праводзіцца культурна-адукацыйная праца з наведвальнікамі як у форме экскурсіі, так і ў форме свята (святкаванне Дня нараджэння) [9].

Такім чынам, у Рэспубліцы Беларусь сёння дзейнічаюць каля 4 дзіцячых музеяў рознай формы ўласнасці і тэматыкі, ад эксперыментарыума да музея міфалогіі, якія карыстаюцца папулярнасцю ў наведвальнікаў. У гульнявой зразумелай форме дзеці спасцігаюць свет, прывучаюцца да культурнага адпачынку, пашыраюць веды. Дзіцячыя музеі адыгрываюць вялікую сацыякультурную ролю ў справе выхавання і сямейнага баўлення вольнага часу.

Стварэнне дзіцячых музеяў з'яўляецца складанай справай, бо пры іх фарміраванні вялікая ўвага надаецца менавіта ўспрыманню музейнай экспазіцыі дзецьмі. Базай для стварэння асобных дзіцячых музеяў, як адзначае Н. У. Караткова, сталі «дарослыя музеі». Спачатку ў іх толькі адводзілася месца для дзіцячых выстаў, ствараліся гульнявыя і інтэрактыўныя зоны, выкарыстоўваўся асобны этыкетаж, разлічаны на дзіцячую аўдыторыю [5, с. 68–69].

Зваротны працэс у развіцці дзіцячых музеяў выявіў Ф. Верпланке. Прыкладам пераходу ад «дзіцячага» да «дарослага» музея стаў «Юнацкі музей» у Меконе (ЗША), зараз «Джэксанвальскі музей мастацтваў і навукі». Мы можам назіраць працэс, калі дзіцячы музей змяняе сваю парадыгму і пераарыентуецца да працы з дарослай аўдыторыяй [10].

Можна зрабіць выснову, што працэс развіцця дзіцячых музеяў паказаў іх дуалістычны характар. Дзіцячы музей можа ўзнікнуць на падмурку «дарослага», і, з другога боку, дзіцячы музей можа эвалюцыяніраваць у бок «дарослага» музея. У «дарослым» музеі працэс музейнай камунікацыі будзе не такім эфектыўным, як у дзіцячым, што тлумачыцца накіраванасцю экспазіцыі менавіта на дарослую аўдыторыю.

На дзіцячы музей сёння ўскладзена місія па культурна-адукацыйнай працы з дзіцячай аўдыторыяй. Выкарыстанне метадаў музейнай педагогікі, акцэнт на псіхалагічныя асаблівасці дзяцей і іх успрыманне інфармацыі з улікам узросту дазваляе казаць пра значную ролю дзіцячых музеяў у працы са сваёй катэгорыяй наведвальнікаў [7, с. 135]. Дзіцячы музей закліканы фарміраваць у дзяцей веды аб навакольным асяроддзі, прыродзе сваёй краіны, ладзе жыцця, першасныя

гістарычныя ўяўленні. Усё згаданае ажыццяўляецца ў цікавай гульнявой форме і таму, безумоўна, больш эфектыўна, чым наведванне «дарослых» музеяў падчас экскурсій. Дзеці, такім чынам, могуць далучыцца да музеяў яшчэ ў дашкольным узросце.

Заўважым, што на заканадаўчым узроўні, напрыклад у Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры, у рэдакцыі 2016 г. у 19-й главе «Музейная справа» ўвогуле не згадваецца такі профіль музеяў, як дзіцячы музей. Выдзяляюцца гістарычныя, прыродазнаўчыя, мастацкія, літаратурныя і комплексныя музеі, якія сумяшчаюць прыметы некалькіх профіляў музеяў [4]. Аднак дзіцячы музей вылучаецца не па прадметнаму крытэрыю, а па крытэрыю вылучэння наведвальнікаў, што ў Кодэксе аб культуры не разглядаецца. І гэта з'яўляецца праблемай, што дзіцячыя музеі ў Беларусі не маюць адпаведнага месца ў прававым полі.

Між тым, стварэнне новых музеяў, разлічаных на дзіцячую аўдыторыю, дазволіць вырашыць шэраг задач. Гэта стварэнне новых працоўных месцаў, расшырэнне гарадской інфраструктуры, якая ў перспектыве можа стаць месцам для наведвання турыстамі. У тым ліку развіцця гарадской супольнасці. Важнейшай мэтай працы дзіцячых музеяў выступае фарміраванне асобы, развіццё нацыянальнай і культурнай ідэнтычнасці, а таксама якасцей будучага грамадзяніна і патрыёта.

1. *Андреева, Н. А.* Детский музей в Полоцке: приглашение к диалогу / Н. А. Андреева // Искусство и культура. – 2019. – № 2 (34). – С. 54–57.

2. *Ахвимович, Н. И.* Детский музей как средство этнокультурного образования / Н. И. Ахвимович // Вестн. АлтГПА: музееведение и сохранение историко-культурного наследия. – 2014. – № 18. – С. 17–19.

3. Детский музей мифологии и леса [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://zaslaue.by/ru/nashy-ab-ekty/dzicjachy-muzej-mifalogii-i-lesu/?ysclid=m10jw3fost123805523. – Дата доступа: 13.09.2024.

4. Кодекс Республики Беларусь о культуре [Электронный ресурс] : 20 июля 2016 г., № 413-З : принят Палатой представителей 17 июня 2016 г. : одобр. Советом Респ. 30 июня 2016 г. : с изм. и доп. от 01.01.2023 г. / ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2024. – Режим доступа: https://etalonline.by/document/?regnum=hk1600413&q_id=10360570. – Дата доступа: 27.09.2024.

5. *Короткова, М. В.* Роль детских музеев и экспозиций в реализации коммуникативного подхода в образовательной деятельности со школьниками / М. В. Короткова // Наука и школа. – 2021. – № 4. – С. 67–74.

6. *Макарова, Н. Г.* Проблемы финансирования детских музеев / Н. Г. Макарова // Серия электронных изданий MUSEUM PRO. Музейная педагогика за рубежом. Работа музеев с детской аудиторией. – 1997. – № 5. – С. 36–39.

7. *Машнюк, Г. А.* Праблемы патрыятычнага выхавання дзіцячай аўдыторыіі ў працы музеяў / Г. А. Машнюк // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2024. – № 2. – С. 131–140.

8. *Медведева, Е. Б.* Музейная педагогика в Германии в прошлом и настоящем / Е. Б. Медведева // Серия электронных изданий MUSEUM PRO. Музей-

ная педагогика за рубежом. Работа музеев с детской аудиторией. – 1997. – № 5. – С. 45–64.

9. Музей Lego в Минске Las-Legos [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://las-legas.by/?ysclid=m10l61jgj8696853505. – Дата доступа: 13.09.2024.

10. *Пушкарева, М. А.* Что такое детский музей? Проблема определения понятия [Электронный ресурс] / М. А. Пушкарева, Е. А. Сенченко // Молодежь и наука : материалы X Всерос. науч.-технич. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых, посвященная 80-летию образования Красноярского края : в 3 т. – Красноярск : Сибирский федеральный ун-т, 2014. – Т. 1. Ч. 1. – С. 206–209. – Режим доступа: https://bik.sfu-kras.ru/ft/LIB2/ELIB/b72/free/i-216505.pdf. Дата доступа: 14.09.2024.

11. Экспозиция [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://kvantumminsk.by/exposition. – Дата доступа: 13.09.2024.

УДК 028:008

**Ю. П. Мелентьева,**

*доктор педагогических наук, профессор, академик Российской академии образования, Заслуженный работник культуры Российской Федерации, заведующий отделом проблем чтения Федерального государственного бюджетного учреждения науки «Научный и издательский центр “Наука” Российской академии наук», Москва, Россия*

## ЧТЕНИЕ КАК ЦЕННОСТЬ ЦИВИЛИЗАЦИОННОГО МАСШТАБА

**Аннотация.** В статье представлено чтение как ценность цивилизационного масштаба. Анализируется становление понятия «ценность», а также таких его модификаций, как материальная, духовная, культурная ценности. Рассматривается понимание ценности чтения в русской философской мысли («русский космизм»). Ценность чтения анализируется на личностном и общественном уровне, т. е. на уровне онто- и филогенеза. Как один из показателей ценности чтения разбирается такое качество, как социальная сила чтения. Делается вывод о необходимости ее изучения сегодня исследователями чтения.

**Ключевые слова:** ценность чтения, чтение как цивилизационное явление, социальная сила чтения.

**Yu. Melentieva,**

*Doctor of Pedagogical Sciences, Professor, Academician of the Russian Academy of Education, Honored Worker of Culture of the Russian Federation, Head of the Department of Reading Problems of the Federal State Budgetary Scientific Institution "Scientific and Publishing Centre “Nauka” of the Russian Academy of Science", Moscow, Russia*

## READING AS A VALUE OF CIVILISATIONAL SCALE

**Abstract.** The article considers reading as a value of civilizational scale. The article analyzes the formation of the concept of "value", as well as its modifications such as material, spiritual, and cultural value. The understanding of the value of